тадычная літаратура, праграмная і мультымедыйная прадукцыя з 5 дыскаў «Культура Беларусі: лепшыя старонкі» для катэгорый спецыялістаў, якія павышаюць кваліфікацыю ў інстытуце.

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

Падчас сустрэчы з калектывам выкладчыкаў і студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў 15 мая 2003 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка асабліва падкрэсліў важнасць пытанняў прафесійнага і сацыяльнага станаўлення творчай моладзі. «У нашай краіне сфарміравалася і паспяхова развіваецца шматступеньчатая дзяржаўная сістэма выяўлення талентаў. Яна дазваляе, па-першае, весці падрыхтоўку спецыялістаў для ўсіх сфер культуры, па ўсіх напрамках і жанрах мастацтваў, па-другое, забяспечвае даступнасць і шырокія магчымасці для развіцця здольнасцей адораных людзей незалежна ад іх месца пражывання і сацыяльнага становішча. Па-трэцяе, з'яўляецца яшчэ і асяроддзем масавага эстэтычнага выхавання. Стаіць на варце культурнай бяспекі нашага грамадства». Так сур'ёзна і высока ацаніў Прэзідэнт нашай краіны сістэму выяўлення талентаў, стрыжнем якой з'яўляецца дзейнасць спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Фонд быў створаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 1995 г. № 473 з мэтай фінансавання мерапрыемстваў, арыентаваных на стварэнне умоў для пошуку, станаўлення і творчага развіцця юных дараванняў, і ўсе гэтыя гады аказваў рэальную і вельмі істотную дапамогу таленавітай моладзі, дзіцячым і маладзёжным мастацкім калектывам, навучальным установам культуры і мастацтваў.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 красавіка 2003 г. былі ўнесены змяненні і дапаўненні ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 студзеня 1996 г. № 18 «Аб спецыяльным фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі». Гэтым жа ўказам унесены таксама змяненні і дапаўненні ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палажэнне аб спецыяльным фондзе. Яно выкладзена ў новай рэдакцыі і ў адпаведнасці з ім савет фонду зацвердзіў Палажэнне аб заахвочванні таленавітых навучэнцаў, студэнтаў, педагогаў, маладых дзеячаў культуры і мастацтваў, якія маюць творчыя дасягненні.

Палажэннем аб заахвочванні ўведзены іх пашыраны пералік і ўстаноўлены наступныя іх віды: гранд-прэміі, прэміі, заахвочвальныя прэміі, стыпендыі, гранты, матэрыяльная дапамога. Уведзена званне лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, якое прысуджаецца ўладальнікам гранд-прэмій за выдатныя творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва на працягу года, які папярэднічае прысуджэнню. Памеры гранд-прэміі наступныя: навучэнцам, студэнтам — 50 базавых велічынь, педагогам, маладым дзеячам культуры і мастацтва — 60, калектывам — 70 базавых велічынь. Распрацаваны і перададзены ў вытворчасць эскіз Знака лаўрэата. Па выніках 2003 г. гранд-прэміі і знакі лаўрэатаў за творчыя дасягненні будуць прысуджаны ў лютым-сакавіку наступнага года.

Упершыню стыпендыі назначаліся са штомесячнай выплатай на працягу каляндарнага года. У залежнасці ад узросту стыпендыятаў яна складала ад 3 да 5 базавых велічынь заработнай платы. У гэтым годзе стыпендыя была прызначана 112 таленавітым прадстаўнікам творчай моладзі. 26 чалавек атрымалі заахвочвальныя прэміі, 41 чалавек — аднаразовую матэрыяльную дапамогу.

Сярод стыпендыятаў шматразовыя лаўрэаты міжнародных конкурсаў Аляксандр Музыкантаў, Аксана Хахол, Вераніка Прадзед, Алег Бабій, Дар'я Мароз, Віталь Стахіевіч, Павел Неўмяржыцкі.

У бягучым годзе выдатна пацвердзілі сваю стыпендыю піяністы Цімур Шчарбакоў і Міхаіл Ялецкі, якія сталі лаўрэатамі Міжнароднага конкурсу піяністаў імя У. Горавіца ў Кіеве, піяніст Васіль Нетук, які ў кастрычніку стаў лаўрэатам Міжнароднага конкурсу піяністаў імя Э. Гілельса ў Адэсе.

Фінансавая падтрымка фонду дазволіла правесці шэраг творчых спаборніцтваў.

23 — 25 мая адбыўся Рэспубліканскі конкурс харавых калектываў дзіцячых школ мастацтваў у Светлагорску Гомельскай вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У конкурсе прынялі ўдзел 11 харавых калектываў, у якіх спявалі 615 дзяцей. Дыпломы першай ступені атрымалі два калектывы ДМШ г. Маладзечна: у малодшай групе — хор малодшых класаў, у старэйшай — узорны хор «Журавушка».

14 — 19 красавіка ў Брэсце, 21 — 26 красавіка ў Гродне праведзены Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на народных інструментах, адпаведна малодшага і старэйшага ўзростаў. У конкурсе ўдзельнічалі 307 дзяцей з усіх абласцей Беларусі, а таксама з Расіі і Украіны. Гран-пры прысуджаны Дар'і Хамянюк, навучэнцы Магілёўскай гімназіі-каледжа музыкі і харэаграфіі, і Кацярыне Янко, навучэнцы ДМШ № 1 г. Гомеля.

14 — 17 мая ў г. Пінску праведзены II Рэспубліканскі фестываль-конкурс харэаграфіі дзіцячых школ мастацтваў, у якім прынялі ўдзел больш за 400 дзяцей з харэаграфічных школ і школ мастацтваў з харэаграфічнымі аддзяленнямі. У намінацыі «Класічны танец» званне лаўрэата і дыплом I ступені атрымала ДХШ г. Барысава, у намінацыі «Народны танец» — ДХШ г. Гомеля. У намінацыі «Пастаноўка канцэртных нумароў» ДХШ г. Мінска атрымала Гран-пры. Навучэнка ДХШ г. Барысава Марыя Фядоцікава стала лаўрэатам фестывалю-конкурсу і ўладальнікам дыплома I ступені.

У лістападзе адбыўся Першы міжнародны конкурс выканаўцаў на струнных смычковых інструментах імя Міхаіла Ельскага. У конкурсе ўдзельнічала звыш ста маладых музыкантаў з нашай краіны, Расіі, Украіны, Малдовы, Кітая, Германіі, якія спаборнічалі ў двух раздзелах: скрыпка і альт, віяланчэль і кантрабас, па дзвюх узроставых групах (навучэнцы сярэдніх спецыяльных і студэнты вышэйшых навучальных устаноў).

Стыпендыят фонду студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Арцём Шышкоў стаў пераможцам у намінацыі «Скрыпка» ў старэйшай групе. У малодшай групе першую прэмію заваявала Ганна Маркава, навучэнка Рэспубліканскага вучэбнага комплексу гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У другой намінацыі (альт, віяланчэль, кантрабас) пераможцамі сталі кантрабасісты ў дзвюх узроставых групах: студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Станіслаў Анішчанка ў старэйшай і навучэнец Рэспубліканскага вучэбнага комплексу гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Дзмітрый Саўчык — у сярэдняй групе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама пры падтрымцы фонду адбыўся Пяты Рэспубліканскі мастацкі конкурс, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі І. В. Ахрэмчыка. У ім удзельнічалі 101 чалавек — адораная моладзь ад 10 да 20 гадоў з розных гарадоў і вёсак Беларусі, пераможцы раённых і абласных мастацкіх конкурсаў. Гран-пры конкурсу заваяваў юны скульптар Максім Шняк, вучань Рэспубліканскага каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка.

29 — 30 лістапада адбыўся Міжнародны рэйтынгавы турнір па спартыўных бальных танцах «Мінск OPEN — 2003», у якім прынялі ўдзел больш за 400 пар з 8 краін свету. Склад журы конкурсу прадстаўлялі суддзі з 11 краін. Лепшага выніку ў турніры сярод беларускіх удзельнікаў дабіліся стыпендыяты фонду, студэнтка і выпускнік БДУ культуры Вольга Столяр і Аляксандр Лявонцьеў, якія па дзвюх праграмах (стандарту і лацінаамерыканскіх танцах) увайшлі ў фінал і занялі чацвёртае месца.

Фондам былі выдзелены сродкі на набыццё музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў дзіцячым музычным школам Гомеля, Барысава, Баранавіч, Мінска (ДМШ № 3), Слаўгарадскай дзіцячай школе мастацтваў; на набыццё матэрыялаў і абсталявання для заняткаў мастацкай творчасцю — дзіцячай мастацкай школе Бабруйска, Мінскаму мастацкаму вучылішчу імя А. К. Глебава.

Гімназія-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка атрымала грант для юнацкага ўзорнага духавога аркестра «Фанфары Нямігі». Гэты дзіцячы калектыў у студзені 2003 года заваяваў другое месца на Міжнародным конкурсе духавых аркестраў у Сан-Рэма (Італія), дае шмат канцэртаў у нашай краіне і ў замежжы. Кіруе ім таленавіты выкладчык Э. Л. Каліноўскі.

Падтрыманы ўзорны ансамбль танца «Зязюлька» Цэнтра выхаваўчай работы «Росквіт» Першамайскага раёна г. Бабруйска.

Атрымалі гранты: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі — на набыццё матэрыялаў і абсталявання для мадэрнізацыі лабараторыі гуказапісу кабінета народнай музыкі, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў — на забеспячэнне творчай дзейнасці студэнтаў мастацкага, тэатральнага, дэкаратыўна-прыкладного мастацтва факультэтаў.

За сродкі фонду набыты канцэртныя раялі Магілёўскім музычным вучылішчам і Светлагорскай дзіцячай школай мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фонд падтрымаў міжнародныя праекты: удзел беларускай дэлегацыі ў II Маладзёжных Дельфійскіх гульнях у Германіі; удзел ансамбля цымбалістаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў VII Сусветным кангрэсе цымбалістаў з 8 па 13 кастрычніка 2003 г. у г. Апенцэль (Швейцарыя). Быў падтрыманы таксама праект «Міжнародны маладзёжны сімфанічны аркестр» — школа маладых музыкантаў у Трыесце (Італія). Юныя беларускія аркестранты ўдзельнічалі ў летнім зборы, які адбыўся ў Славеніі, а потым восенню пасля рэпетыцый у курортным мястэчку Ныса (Польшча) далі канцэрты ў Празе і Варшаве, а 22 лістапада — у Мінску. Узрост аркестрантаў ад 14 да 19 гадоў, яны належаць да 9 краін Еўропы: Аўстрыі, Беларусі, Чэхіі, Харватыі, Венгрыі, Італіі, Сербіі, Польшчы, Славеніі. Наперадзе — зімовы збор зноў у Славеніі.

Фонд выдзеліў грошы студэнтам тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў для ўдзелу ў V Міжнародным фестывалі лялечных тэатраў у Магдэбургу (Германія); вакальна-харэаграфічнаму ансамблю «Валачобнікі» Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры для ўдзелу ў X Міжнародным фестывалі народных традыцый у Віка-Экуэнсе (Італія).

Прафінансавана творчая школа «Рэспубліканскі сімфанічны юнацкі аркестр», у якой прынялі ўдзел юныя аркестранты з музычных навучальных устаноў усіх абласцей ва ўзросце ад 14 да 21 года. Рэпетыцыі адбываліся ў жніўні і спалучаліся з адпачынкам. Аркестр выступіў з некалькімі канцэртамі ў Германіі падчас прэзентацыі Дэльфійскіх гульняў. Па выніках школы 4 верасня з вялікім поспехам адбыўся канцэрт у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета пад кіраўніцтвам славутага дырыжора Аляксандра Анісімава.

Быў таксама падтрыманы ўдзел беларускага прадстаўніка ў 58-й штогадовай Генеральнай асамблеі «Маладыя музыканты» ў Дубліне (Ірландыя).

Выдзелены сродкі Рэспубліканскаму вучэбнаму комплексу гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі для арганізацыі ўдзелу ў міжнародных конкурсах у Расіі, Чэхіі, Іспаніі, Літве; на арганізацыю стажыровак студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у Мюнстэрскай мастацкай акадэміі (Германія), выкладчыка Гродзенскай школы-інтэрната для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяцей сляпых і з аслабленным зрокам у Пражскай кансерваторыі для сляпых музыкантаў.

Бягучы год зноў пацвердзіў, што наша краіна багатая на таленты, што іх заўважаюць і падтрымліваюць і маральна, і матэрыяльна. На гэта скіравана ўся дзейнасць спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, які аказвае рэальную дапамогу юным мастакам, музыкантам, кампазітарам, танцорам, усім, хто ярка праяўляе сябе ў мастацтве.

Удзяляецца ўвага падтрымцы раённых і сельскіх дзіцячых школ мастацтваў і іншых устаноў культуры сяла, якія з'яўляюцца асноўнымі, а падчас і адзінымі цэнтрамі эстэтычнага выхавання і арганізацыі вольнага часу свайго рэгіёна. Значная дапамога аказана вышэйшым навучальным установам па ажыццяўленню творчых праграм іх развіцця.

Стыпендыятам былі прадастаўлены лепшыя выставачныя і канцэртныя залы: Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Палац мастацтваў, студэнцкая мастацкая галерэя Палаца Рэспублікі, музей Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, канцэртныя залы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Рэспубліканскага вучэбнага комплексу гімназія-каледж.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ